ныя складанасці, адсутнасць падручнікаў і дапаможнікаў, недахоп спецыялістаў і выкладчыкаў. Калі б была дзяржаўная воля рухацца ў гэтым кірунку (падтрымка, агітацыя, прававое зябеспячэнне, фінансаванне), за амаль чвэрць стагоддзя, прамінулых з часу распаду СССР, гэта праблема была б вырашана.

А пакуль яе рашэнне застаецца задачай на бліжэйшую і аддаленую будучыню.

Пры гэтым адзначым, што беларуская нацыянальная і моўная талерантнасць выключае нейкую дыскрымінацыю рускай, польскай ці іншых моў. Сур'ёзных сацыяльных канфліктаў на гэтай глебе не назіралася і, упэўнены, не будзе.

Што можна лічыць аб'ектам фарміравання беларускай ідэнтычнасці? Грамадскую псіхалогію і грамадскую актыўнасць (паводзіны і дзейнасць) людзей, што з яе вынікае.

Грамадская псіхалогія не з'яўляецца арыфметычнай сумай псіхічных працэсаў і ўласцівасцяў асобных індывідаў. Статыстычна яна ўяўляе сабой дамінуючыя, пануючыя ў пэўнай сацыяльнай прасторы ўспрыманні, уяўленні і іншыя псіхічныя працэсы (напрыклад, уздым патрыятызму падчас справядлівай вайны, разгубленасць і роспач падчас сацыяльна-эканамічных крызісаў і інш.). Паколькі фенаменалагічна структура грамадскай свядомасці адпавядае свядомасці індывідуальнай, мы можам вылучыць яе складнікі: нацыянальнае (грамадскае) адчуванне, успрыманне, уяўленне, памяць, увага, мысленне, эмоцыі і пачуцці; нацыянальны тэмперамент, характар, воля, здольнасці; нацыянальныя патрэбнасці, каштоўнасці, інтарэсы, ідэалы, перакананні, прынцыпы, вераванні.

Задача дзяржавы і грамадзянскай супольнасці — спрыяць напаўненню гэтых паняццяў адпаведным зместам. Перадумовамі гэтага працэсу выступаюць:

1) агульнаграмадская згода адносна галоўных нацыянальных каштоўнасцяў і інтарэсаў (ці хаця б адсутнасць глыбіннага расколу па палітычных, рэлігійных, культурных, геаграфічных і іншых лініях падзелу грамадства; узгадаем для кантрасту трагедыю нашай братняй паўднёвай краіны);

2) эфектыўная дзейнасць галоўных сацыяльных інстытутаў з выкарыстаннем адпаведных сродкаў і інструментаў. Сярод іх у першую чаргу вылучым: а) інстытуты выхавання і адукацыі (сям'ю, навучальныя ўстановы, гурткі); б) установы культуры (музеі, тэатры, бібліятэкі); в) сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі (тэлебачанне, радыё, друк, Інтэрнэт); г) палітычныя і прававыя інстытуты; д) інстытуты адпачынку і вольнага часу (спорт, эстрада, турфірмы і інш.); е) эканамічныя інстытуты (па ўсім ланцугу «вытворчасць—гандаль—спажыванне»).

Пералік складнікаў ідэнтычнасці беларускага грамадства не перашкаджае ўсведамляць, што значную частку жыцця чалавека падзеі вакол яго вымагаюць не агульнаграмадскай (нацыянальна-грамадзянскай), а іншых ідэнтыфікацый: прафесіянальнай, гендарнай, сямейнай, партыйнай і інш. Гэта непазбежна і гэта натуральна. Купляючы беларускі тавар у краме, чалавек гэта робіць перш за ўсё як спажывец, як член сям'і, а не як беларус. Вырабляючы прадукт на прадпрыемстве, ён выступае ў першую чаргу як працаўнік, прафесіянал, той жа здабытчык сродкаў для сям'і, а не як патрыёт Радзімы. Але калі гэты апошні чыннік прысутнічае нават фонам, неўпрыкмет, напаўсвядома — гэта ўжо маленькая цаглінка ў сцены беларускага дома, які мы будуем разам. І калі з такіх цаглінак наш дом паўстане трывалым, надзейным, то ў патэнцыяльна вырашальныя моманты менавіта нацыянальна-грамадзянская ідэнтычнасць выступіць псіхалагічным ядром рашучай дзейнасці народа па ахове сваёй незалежнасці і свабоды. Наша гісторыя сведчыла пра тое шмат разоў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Евароўскі, В. Б.* Нацыянальная філасофія Беларусі: тэорыя, археалогія, гісторыя, генеалогія, школа / В. Б. Евароўскі ; навук. рэд. Л. Ф. Яўменаў. — Мінск : Беларус. навука, 2014. — 559 с.

УДК 323.1(476)+94(476)"1929/1939"

**М. К. Альховік**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», Мінск*

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ ВА ЎМОВАХ САВЕЦКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ 1929—1939 ГАДОЎ У БССР

Праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці і ідэнтычнасці займалі асаблівае месца ў праграме бальшавіцкай партыі. УКП(б) разглядала нацыянальнае пытанне як вытворнае ад класавага і звязвала яго вырашэнне з зацвярджэннем дыктатуры пралетарыяту, ліквідацыяй нацыянальных прывілеяў і абмежаванняў, забеспячэннем нацыянальнага раўнапраўя, права нацый на самавызначэнне, выраўноўваннем узроўняў сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця «нацыянальных ускраін» і цэнтральных губерняў. Пад нацыяй разумелася агульнасць людзей, якая гістарычна склалася і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры [1, с. 6—8]. «Эксплуататарскія элементы» падлягалі

© Альховік М. К., 2018

ліквідацыі пасля пралетарскай рэвалюцыі, аб’ектам нацыянальнай палітыкі з’яўляліся «працоўныя элементы» нацый (ужо ў 1916 г. у «Выніках дыскусіі аб самавызначэнні» У. І. Ленін ужыў тэрмін «сацыялістычныя нацыі»). Савецкая ўлада асудзіла нацыянальную палітыку царскага ўрада як накіраваную на дэнацыяналізацыю і асіміляцыю насельніцтва. Пры ацэнцы характару нацыянальных адносін у Расійскай імперыі ў дачыненні да рускай нацыі выкарыстоўваліся такія тэрміны, як «прыгнятальная», «каланізатарская», «перадавая», «найбольш развітая», да іншых нацый — «прыгнечаныя», «адсталыя», «малыя». На рускі пралетарыят ускладаўся абавязак кампенсацыі наступстваў каланіяльнай і эксплуататарскай палітыкі царскага ўрада. На пачатковым этапе дыктатуры пралетарыяту прадугледжвалася спрыянне дзяржаўнаму будаўніцтву, эканамічнаму і культурнаму росквіту «ўскраін» пад лозунгам «пралетарскага інтэрнацыяналізму». Стратэгічнай мэтай з’яўлялася не ўмацаванне нацыянальнай і культурна-моўнай разнастайнасці, а паступовае адміранне нацыянальных асаблівасцяў, зліццё нацый пасля поўнай і канчатковай перамогі камунізму ва ўсім свеце [2, с. 31, 35, 38, 56, 68—70, 128].

1 студзеня 1919 г. Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Беларусі абнародаваў канстытуцыйны акт аб абвяшчэнні ССРБ. У снежні 1920 г. ІІ Усебеларускі з’езд саветаў аб’явіў курс на шырокае выкарыстанне ў дзяржаўным і грамадскім жыцці моў мясцовага насельніцтва, стварэнне сеткі адукацыйных і культурна-асветніцкіх установ, выданне друкаванай прадукцыі, вылучэнне работнікаў карэнных нацыянальнасцяў. Беларусы ўспрымаліся як асноўная, тытульная, колькасна пераважаючая ў БССР нацыя, таму пленум ЦК КП(б)Б ад 25—29 студзеня 1925 г. прызнаў вылучэнне беларускіх кадраў, развіццё беларускай мовы і культуры «першай і асноўнай справай» нацыянальнай палітыкі ў БССР [3, с. 58—69; 4, с. 27].

Палітыка беларусізацыі заключалася ў абслугоўванні тытульнага насельніцтва на роднай мове, будаўніцтве беларускай пралетарскай культуры, забеспячэнні перавагі беларусаў у органах улады і кіравання, у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі. Права нацый на самавызначэнне прадугледжвала задавальненне нацыянальных патрэб нятытульнага насельніцтва: яго абслугоўванне дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі на роднай мове, стварэнне нацыянальных саветаў, калгасаў, школ, судоў і г. д., выданне літаратуры. Каранізацыя палягала ў выхаванні і вылучэнні мясцовых кадраў (у першую чаргу беларусаў) на адказныя і кіраўнічыя пасады па прынцыпе прапарцыйнага прадстаўніцтва нацый. Уключэнне ў склад БССР земляў з адносна аднародным нацыянальным складам насельніцтва, укараненне беларускай мовы і моў нацыянальных меншасцяў у сферы адукацыі, інфармацыі, навукі, у афіцыйнае справаводства, нацыянальна-культурная палітыка разглядаліся ў якасці сродку ўзмацнення нацыянальнай самасвядомасці працоўных, прапаганды ідэалогіі бальшавізму, неабходнай умовы «пралетарскага кіраўніцтва бядняцка-серадняцкім сялянствам», эканамічнай і культурнай мадэрнізацыі БССР, умацавання дзяржаўнай граніцы, узмацнення прасавецкіх сімпатый за мяжой і недапушчэння выхаду БССР са складу СССР [5, с. 110; 6, арк. 11; 7, арк. 31].

Частка партыйна-савецкіх дзеячаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі аспрэчвала прыярытэт класавага пытання над нацыянальным, разглядала беларусізацыю як важны этап нацыянальнага адраджэння, сродак узмацнення нацыянальнай самасвядомасці, палітычнай актыўнасці і самаарганізацыі насельніцтва. Яны выступалі за фарсіраванне працэсаў беларусізацыі, культурнае адасабленне і гаспадарчую аўтаномію БССР, вызначэнне межаў рэспублікі ў адпаведнасці з арэалам пражывання беларусаў, будаўніцтва пралетарскай культуры на аснове «пазакласавай» гісторыка-культурнай спадчыны. Улады БССР сцвярджалі, што дадзеныя ўяўленні адлюстроўваюць палітычную стратэгію, накіраваную на канстытуіраванне альтэрнатыўных палітычных эліт, надкласавай палітычнай нацыі, суверэнізацыю і мадэрнізацыю БССР па «дробнабуржуазным» шляху [8, с. 28, 32; 9, с. 35]. Адначасова ў БССР існавалі прыхільнікі асіміляцыі нярускага насельніцтва пад лозунгам «адзінай і непадзельнай Расіі». Яны выступалі супраць стварэння дзяржаўных інстытутаў і адзінак па нацыянальнай прыкмеце, супраць беларускай савецкай дзяржаўнасці, адмаўлялі існаванне беларускага пралетарыяту і беларусаў як нацыі, неабходнасць падтрымкі беларускай мовы і культуры і інш. [10, с. 23].

У адпаведнасці з ідэалогіяй марксізму-ленінізму, сацыялістычная (пралетарская) культура стваралася на аснове інтэрнацыянальных, рэвалюцыйна-дэмакратычных элементаў традыцыйнай народнай культуры і побыту і супрацьпастаўлялася «феадальна-буржуазнай». Мова разглядалася ў якасці адной з найважнейшых пазакласавых прыкмет нацыі. У канстытуцыйных актах і заканадаўстве СССР і БССР 1920—1930-х гг. тэрмін «дзяржаўная мова» адсутнічаў, бо У. І. Ленін выступаў супраць дэкрэтавання абавязковай дзяржаўнай мовы, за моўнае раўнапраўе і добраахвотны характар вывучэння рускай мовы. У якасці прыкладу суіснавання розных моў у адной дзяржаве называлася Швейцарыя. Партыйна-савецкія работнікі дэкларавалі «ліквідацыю прывілеяванага становішча» рускай мовы [11, с. 295; 12, с. 39]. Адначасова ўлады выступалі за свабоднае нацыянальнае і моўнае самавызначэнне асобы. У афіцыйных дакументах роднай мовай лічылася найбольш зразумелая і даступная чалавеку размоўная мова, якую ён ужываў у побыце, у размовах з бліжэйшым акружэннем. Падмена роднай мовы мовай нацыянальнасці або мовай продкаў, схіленне да ўжывання іншых моў лічыліся ўхіламі ад «ленінскай нацыянальнай палітыкі». Да снежня 1933 г. у мэтах пераадолення наступстваў русіфікацыі вялікая частка дзяржаўных работнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі механічна атаясамляла родную мову чалавека з мовай яго нацыянальнасці [13, с. 124, 204, 238].

9 мая — 27 чэрвеня 1929 г. у БССР працавала Камісія ЦКК УКП(б) на чале з У. П. Затонскім. Яна прапанавала працягваць і больш рашуча праводзіць беларусізацыю, але прызнала тэмпы развіцця беларускай мовы дастатковымі для абслугоўвання працоўных мас. Пленум ЦК КП(б)Б ад 5—8 верасня 1929 г.

вызначыў ліквідацыю эксплуататарскіх класаў і ўхілаў у бок нацыяналізму ў якасці ўмовы паспяховага нацыянальнага будаўніцтва. Пленум ЦК КП(б)Б ад 20—25 кастрычніка 1930 г. прызнаў правядзенне нацыянальнай палітыкі ў БССР у асноўным правільным. ЦК КП(б)Б дэклараваў захоўванне курсу на правядзенне беларусізацыі, заклікаючы працаўнікоў і актывістаў да ўзмацнення класавай лініі ў «нацпытанні» [14, с. 32]. Вылучэнне работнікаў на адказныя і кіраўнічыя пасады без уліку «ідэалагічнай вытрыманасці» і сацыяльнага складу, разуменне нацыянальнай палітыкі як выключна «барацьбы за мову і за культуру» былі асуджаны як праявы «нацыяналізму» і «культурніцтва» [15, с. 191—198; 16, с. 207—209].

Узмацненне прэстыжнасці і павелічэнне сацыяльных функцый беларускай мовы было немагчыма без прыстасавання дзяржаўнага апарату да яе выкарыстання. Беларуская мова была выбрана пераважнай для зносін дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый. Камуністам, камсамольцам, работнікам дзяржаўных устаноў, прафесійных, гандлёва-кааперацыйных арганізацый прапаноўвалася карыстацца ў справаводстве, падчас публічных мерапрыемстваў, у размовах паміж сабой і з насельніцтвам беларускай мовай, пастаянна ўдасканальваючы свае веды, ведаць беларускую літаратуру, культуру, гісторыю і эканоміку БССР, гісторыю КП(б)Б і ЛКСМБ, улічваць мясцовыя ўмовы, традыцыі і побыт беларусаў і г. д. [17, с. 4; 18, арк. 68]. І тым не менш у канцы 1920-х — пачатку 1930-х гг. паслядоўная і сістэмная работа камісій, органаў улады і кіравання ў галіне вырашэння нацыянальнага пытання адсутнічала [19, арк. 13—15]. Беларусізацыя ахапіла дакументазварот, рэгістратуру, выпіску і выданне газет, чытанне дакладаў і справаздач, афармленне шыльдаў і г. д. Падчас спрэчак на сходах і пасяджэннях, у прыватных гутарках і рабоце з наведвальнікамі большасць работнікаў пераходзіла на рускую мову. Так, у Слуцкім раёне дакументацыя вялася на беларускай мове, але толькі чвэрць супрацоўнікаў ужывала яе ў вуснай форме [20, арк. 70]. У канцы 1920-х — пачатку 1930-х гг. колькасць беларусаў на адказных і кіраўнічых пасадах практычна не змянілася, паколькі галоўная ўвага надавалася «ідэалагічнай вытрыманасці» і сацыяльнаму паходжанню работнікаў [21, арк. 13].

Яшчэ ў 1921 г. падчас X З’езда РКП(б) І. В. Сталін параўнаў ліквідацыю перавагі «рускіх элементаў» у гарадах БССР і УССР з «мадзьярызацыяй венгерскіх гарадоў і пераўтварэннем Рыгі ў латышскі горад». «Беларусізацыя пралетарыяту» (павелічэнне ліку беларусаў у складзе гараджан) была абумоўлена не толькі масавай міграцыяй сельскіх жыхароў, але і пераменамі ў самавызначэнні асобных пралетарыяў, якія ў 1926—1927 гг. запісваліся рускімі [22, арк. 45]. У мэтах укаранення беларускай мовы ў паўсядзённае жыццё індустрыйных цэнтраў і ўцягнення рабочых у будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры адбывалася навучанне і папулярызацыя «беларускай мовы, быту, культуры» сярод гараджан. Пры гэтым улады ўказвалі на неабходнасць дыферэнцыраванага падыходу да рабочых з пункту гледжання нацыянальнасці, ведаў і гатоўнасці ўжываць беларускую мову, патрабавалі, каб яе вывучэнне і ўжыванне з’яўлялася свядомым і добраахвотным актам. Да 1932 г. справаводства і культурна-масавая работа на прадпрыемствах былі ў асноўным пераведзены на беларускую мову. Руская мова дамінавала ў штодзённых зносінах прафесійных работнікаў, падчас нарад і пасяджэнняў [23, арк. 50; 24, арк. 54]. Беларуская мова станавілася мовай міжнацыянальных зносін, сельскай і гарадской культуры, цэнтр беларускай ідэнтычнасці змяшчаўся ў горад, што садзейнічала кансалідацыі беларускай нацыі. Вялікая частка рабочых падтрымала беларусізацыю, сустракаліся выпадкі свядомага пераходу на беларускую мову. Многія рабочыя ў побыце аддавалі перавагу рускай мове, а беларускую ўжывалі на рабоце. Нярэдкімі былі выпадкі пагардлівага стаўлення да беларускай культуры і мовы, неразумення беларускай літаратурнай мовы і публічнай адмовы ад яе ўжывання [25, арк. 16, 28—29; 26, арк. 3].

Савецкая ўлада прытрымлівалася курсу на забеспячэнне перавагі беларускай сацыялістычнай культуры і друкаванай прадукцыі на беларускай мове ў БССР, аб чым сведчыла стварэнне беларускага аддзялення Цэнтральнага кіраўніцтва Дзяржаўнага аб’яднання музычных, эстрадных і цыркавых прадпрыемстваў (1930), рэарганізацыя Тэатра рускай музычнай камедыі ў Тэатр музычнай камедыі БССР з наступным пераводам яго пастановак на беларускую мову (10 снежня 1932 г.), адкрыццё Беларускай студыі пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе (1933), прыкметны рост тыражоў беларускіх кніг і перыядычных выданняў, фонду кінакарцін на беларускай мове і да т. п. Так, у 1932 г. па-беларуску выдавалася 27 з 30 часопісаў, у 1933 г. — 259 з 293 газет, кніжная прадукцыя БДВ на беларускай мове складала каля 90% [27, арк. 111, 146]. На мяжы 1920—1930-х гг. доля беларускіх школ вагалася ў межах 90%. У якасці вучэбнага прадмета беларуская мова выкладалася незалежна ад паходжання навучэнцаў. У пачатку 1930-х гг. беларусізацыя вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, палітыка-асветных і культурна-асветных устаноў не была завершана [28, арк. 86].

Істотнай праблемай нацыянальнай палітыкі з’яўлялася слабая нацыянальная самаідэнтыфікацыя католікаў. Дадзеныя перапісу 1926 г. лічыліся недакладнымі, бо частка польскага насельніцтва была залічана ў беларусы, частка беларусаў — у палякі. У гэтай сувязі работа сярод часткі католікаў БССР і УССР, якія ў побыце размаўлялі па-беларуску і па-ўкраінску, праводзілася на польскай мове [29, арк. 114]. Расцэньваліся як «дэфектныя» і дадзеныя перапісу 1926 г. па Гомельскай і Рэчыцкай акругах. У рускіх сельсаветах адкрываліся і беларускія, і рускія школы, масавая работа з насельніцтвам праводзілася на дзвюх мовах, асобныя работнікі лічылі рускія сельсаветы штучнымі. У 1933 г. Церахоўскі РВК прапанаваў ЦВК БССР аб’явіць 5 рускіх сельсаветаў беларускімі [30, арк. 58]. У тлумачальнай запісцы Я. Г. Ракава і І. В. Нікольскага да карты нацыянальнага складу БССР (1935) адзначалася, што па выніках пашпартызацыі 1933 г. «у Церахоўскім раёне ва ўсіх 4-х рускіх сельсаветах ніводнага рускага. Тое ж у Чачэрскім, Свяцілавіцкім, Камарынскім раёне, у Харашэўскім рускім сельсавеце Добрушскага раёна, Гомельскім раёне» [31, арк. 189].

Уласцівыя таталітарным рэжымам канцэнтрацыя ўладных і эканамічных рэсурсаў, ігнараванне нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі падчас прыняцця важных дзяржаўных рашэнняў садзейнічаюць фарміраванню гамагеннага грамадства з разнастайных нацыянальных груп на падставе агульных грамадзянскіх ідэалаў і культурна-моўных стандартаў [32, с. 236]. Рэвізія канцэптуальна-тэарэтычных асноў і арыенціраў нацыянальнага будаўніцтва была ініцыявана кіраўніцтвам СССР. 18 мая 1925 г. падчас прамовы ў Камуністычным універсітэце працоўных Усходу І. В. Сталін прызнаў, што пры будаўніцтве сацыялізму «некаторыя нацыянальнасці могуць падпасці і, мабыць, пэўна падпадуць пад працэс асіміляцыі, …[які] не выключае, а мяркуе супрацьлеглы працэс узмацнення і развіцця цэлага шэрага магутных нацыянальнасцяў» [33, с. 159]. Ужо ў дакладной запісцы намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходнім краі І. К. Апанскага сакратару ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкаму ад 28 снежня 1924 г. выказвалася незадаволенасць зместам, тэмпамі і метадамі беларусізацыі. 4 лістапада 1925 г. на пасяджэнні Аргбюро ЦК РКП(б) па пытанні аб стане і рабоце КП(б)Б наркам земляробства РСФСР А. П. Смірноў, загадчык Аддзела агітацыі і прапаганды ЦК РКП(б) А. І. Сырцоў, адказны інструктар ЦК РКП(б) А. В. Осіпаў, загадчык Арганізацыйна-размеркавальнага аддзела ЦК РКП(б) К. В. Гей выступілі супраць беларусізацыі і работы сярод нацыянальных меншасцяў [34, с. 30—31; 35, с. 336—345]. У 1929 г. у артыкуле «Нацыянальнае пытанне і ленінізм» (апублікаваны ў 1950 г.) І. В. Сталін дапусціў магчымасць з'яўлення занальных эканамічных цэнтраў «для асобных груп нацый з асобнай агульнай мовай» да моманту адмірання нацый [36, с. 14—19].

У 1933—1937 гг. рускія былі выкраслены з пераліку нацыянальных меншасцяў. У 1935—1937 гг. улады СССР заявілі аб пераадоленні недаверу да рускай нацыі, якая ўжо не тытулавалася прыгнятальнай. У дачыненні да яе ўжываліся такія эпітэты, як «вялікі», «старэйшы брат», «бессмяротны», «першы сярод роўных» і г. д. [37, с. 71]. Поспехі ў будаўніцтве дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці БССР увязваліся з дапамогай партыйна-савецкага кіраўніцтва СССР, рускага пралетарыяту і РСФСР («першай сярод роўных»), што прыводзіла да ўспрыняцця БССР, ЦК КП(б)Б, ЦВК БССР і СНК БССР як чагосьці вытворнага і другараднага [38, арк. 121]. «Маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадства» забяспечвалася шляхам вызначэння БССР і УССР як «непрыступных крэпасцяў абароны» СССР, прапаганды бальшавізму і «савецкага патрыятызму», спрадвечнай еднасці і «сталінскай дружбы народаў», перавагі і вяршэнства рускага пралетарыяту, далучэння да рускай мовы (як другой роднай мовы), гісторыі і культуры, ігнаруючы прынцып нацыянальнага, культурнага і моўнага раўнапраўя [39, арк. 179]. Паняцці «Расія», «рускі», «савецкі», «камуністычны», «сталінскі» ставіліся на адзін сэнсавы ўзровень [40, с. 14]. У 1938—1939 гг. у масавым друку БССР з'явілася паняцце «савецкі народ» [41].

У пастановах ЦК УКП(б) «Аб сельскагаспадарчых нарыхтоўках у Беларусі» ад 19 снежня 1932 г. і «Аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі УКП(б) у Беларусі» ад 2 сакавіка 1933 г. партыйна-савецкія работнікі БССР былі абвінавачаны ў ажыццяўленні «гвалтоўнай беларусізацыі». Сцвярджалася, што «небальшавіцкая», «нацдэмаўская», «механічная» і «прымусовая» беларусізацыя была накіравана на зрыў сельскагаспадарчых нарыхтовак, аддаленне беларускай мовы ад рускай, спрыянне замежнай інтэрвенцыі, выхаду БССР са складу СССР і рэстаўрацыі капіталізму. У Канстытуцыі БССР 1937 г. адсутнічала палажэнне пра асаблівы статус беларускай мовы, якое ўтрымлівалася ў Канстытуцыі БССР 1927 г. У 1938 г. народны камісар асветы БССР У. І. Півавараў публічна заявіў, што «руская мова — гэта асноўная дзяржаўная мова, беларуская і яўрэйская — гэта другарадныя, яўрэйскай мове навучаюць у Бірабіджане, і хто хоча вывучаць яўрэйскую мову, няхай той едзе ў Бірабіджан» [42, арк. 250]. У канцы 1930-х гг. работнікі і грамадскія актывісты былі вызвалены ад неабходнасці валодання беларускай мовай [43, арк. 369, 365], цэнтралізаваны перавод устаноў і арганізацый на беларускую мову быў абвешчаны антысавецкай работай, накіраванай на «падрыў пазіцый» рускай мовы і культуры ў БССР [44, с. 78].

Успрыняўшы рашэнні ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б як сігнал аб згортванні беларусізацыі і асцерагаючыся абвінавачванняў у «нацыяналізме», работнікі савецкіх устаноў, партыйных і грамадскіх арганізацый адмовіліся ад ужывання беларускай мовы.Так, у 1933 г. работнік Белкаапсаюза Туркевіч апраўдаў свой пераход на рускую мову тым, што «карыстанне беларускай мовай ёсць праява нацдэмакратызму», работнікі Ваксман, Сулькіна, Андросенка — тым, што «больш цяпер карыстаюцца рускай мовай, а таму і мы карыстаемся ёй», начальнік агітацыйна-прапагандысцкага аддзела гарадского савета Гомеля Шапіра адмовіўся распаўсюджваць літаратуру сярод гомельскіх рабочых, матывуючы гэта тым, што «рабочыя не ведаюць беларускую мову» [45, арк. 85; 46, арк. 50—53]. У сярэдзіне 1930-х гг. пачаўся несанкцыянаваны перавод беларускіх школ на рускую мову, у 1938—1939 гг. — афіцыйная рэарганізацыя беларускіх школ у рускія [47, арк. 179—180; 48, арк. 167, 172]. На рускую мову былі пераведзены ВНУ, ССНУ, ВТНУ і рабфакі. Так, студэнты Горацкага сельскагаспадарчага інстытута меркавалі: «хочаце, каб вас не звалі нацдэмамі, не вывучайце беларускай мовы» [49, арк. 113—115].

Савецкая ўлада адмовілася ад захавання дамінуючага становішча беларускай савецкай культуры ў БССР. Так, 8 верасня 1937 г. Бюро ЦК КП(б)Б ліквідавала Гомельскі драматычны беларускі тэатр (былы БДТ-3) [50, арк. 10а]. Замест яго ў 1938—1939 гг. у Гомелі былі створаны Дзяржаўны лялечны тэатр БССР (працаваў на рускай мове) і Рускі абласны дзяржаўны драматычны тэатр [51, с. 23]. У 1937—1938 гг. дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Ф. А. Ярыкаў пры падтрымцы в. а. першага сакратара ЦК КП(б)Б А. А. Волкава і в. а. другога сакратара ЦК КП(б)Б А. М. Лявіцкага адмовіўся ад пастановак беларускага рэпертуару, складання дамоў з беларускімі кампазітарамі, разагнаў кадры мясцовых

артыстаў, салістаў, аркестрантаў, харыстаў як «заражаных нацыяналізмам» і запрасіў работнікаў з іншых рэспублік СССР [52, с. 280—300]. У другой палове 1938—1939 гг. НКУС БССР праводзіў агентурную распрацоўку беларускіх пісьменнікаў, якія засталіся на свабодзе (Я. Купалы, Я. Коласа, П. Е. Панчанкі, У. І. Кандрацені, У. І. Краўчанкі, Э. С. Каган-Агняцвет, М. Ц. Лынькова) [53, арк. 114—117; 54, арк. 7—9 зв].

У сярэдзіне 1930-х гг. прадстаўнікі палітычнай эліты СССР прыйшлі да высновы аб тым, што знікненне моўнай разнастайнасці, побытавых звычаяў, нацыянальных асаблівасцяў з'яўляецца прагрэсіўнай з'явай і заканамерным вынікам сацыялістычнай мадэрнізацыі. Так, 28 мая 1934 г. старшыня ЦВК СССР М. І. Калінін заявіў аб тым, што «яўрэйскія мястэчкі цяпер аджываюць свой век», а яўрэі «ў нас даўжэй за ўсё захаваюцца ў сваёй Яўрэйскай вобласці» і на заводах з вялікім працэнтам яўрэяў [55, с. 7—14]. Абслугоўванне нятытульнага насельніцтва на роднай мове было асуджана як контррэвалюцыйная дзейнасць. З лютага 1934 г. былі ліквідаваны ці рэарганізаваны практычна ўсе ўстановы і арганізацыі нацыянальных меншасцяў. Пэўным выключэннем з'яўляліся яўрэі. Згодна з пастановай Бюро ЦК КП(б)б ад 8 мая 1938 г. «Аб сетцы і базах размяшчэння тэатраў БССР» Дзяржаўны яўрэйскі тэатр пераводзіўся з Мінска ў Віцебск і павінен быў абслугоўваць галоўным чынам «перыферыю і раённыя цэнтры БССР» [56, арк. 244—245]. Намеснік загадчыка культурна-асветнага аддзела ЦК КП(б)Б Г. М. Аронаў даказаў, што рэалізацыя пастановы прывядзе да ліквідацыі тэатра, таму тэатр праіснаваў да 1949 г. [57, арк. 94]. Да 1941 г. у Мінску выходзілі штомесячны часопіс «Штэрн» і штодзённая газета «Акцябер». Яўрэйскія пісьменнікі і літаратурныя работнікі трапілі пад распрацоўку НКУС БССР за «буржуазна-нацыяналістычную прапаганду». У 1935 г. лік членаў яўрэйскай секцыі ССП БССР зменшыўся да 34, у 1939 г. — да 20, але яна праіснавала да 1949 г. [58, арк. 42—44].

З'явілася рэальная небяспека дэнацыяналізацыі беларусаў, палякаў, яўрэяў і г. д., бо ў выпадку слабай самаідэнтыфікацыі асобы яе нацыянальнасць вызначалася прадстаўнікамі ўлады паводле гутарковай мовы і культурных арыентацый. Між іншым, любая нацыянальна-дзяржаўная і адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка СССР стваралася на тэрыторыі пражывання яе тытульнага этнасу [59, арк. 260—308]. Так, нягледзячы на працяглы тэрмін правядзення беларусізацыі, у 1939 г. толькі 45,7% гараджан-беларусаў назвалі беларускую мову роднай (у 1926 г. — 50,3%). У 1938 г. член Бюро ЦК КП(б)Б старшыня Вярхоўнага Савета БССР Н. Р. Грэк змяніла сваё прозвішча на рускае (Грэкава). Калі ў 1927 г. у БССР пражывала 407,1 тыс. яўрэяў, у 1931 гг. — 440,2 тыс., у 1937 г. — 363,2 тыс., у 1939 г. — 375,1 тыс. Перапісы 1926 і 1939 г. зафіксавалі зніжэнне долі палякаў з 1,9% (97,5 тыс.) да 1% (58,4 тыс.) У Хрыпялеўскім сельсавеце замест этноніма «палякі» уладамі ўжываўся эўфемізм «каталікі» ў значэнні нацыянальнасці [60, арк. 1].

Рэакцыя на радыкальныя змены ў правядзенні савецкай нацыянальнай палітыкі была неадназначнай. Палякі, якія атаясамлялі сябе з навакольным насельніцтвам, арыентаваліся на рускую савецкую культуру і слаба валодалі польскай мовай, адобрылі рэарганізацыю польскіх устаноў. Асіміляваныя яўрэі лічылі немэтазгодным існаванне дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў. Нацыянальна свядомыя палякі выкарыстоўвалі ў жыцці польскую і беларускую мовы, выступілі за захаванне польскіх устаноў. Яўрэі ў раёнах Ляхаўкі, Старажоўкі, Абутковай вуліцы ў Мінску, Гомелі, местачковых саветах гуртаваліся з прадстаўнікамі сваёй нацыянальнасці, захоўвалі прыхільнасць да традыцыйнай культуры на аснове іўрыта і іўдаізму або да савецкай культуры. Менавіта таму рэарганізацыя польскіх і яўрэйскіх устаноў выклікала мабілізацыю іх нацыянальных пачуццяў [61, арк. 259—311, 62, арк. 92; 63, арк. 25—26]. Ва ўмовах палітычнага тэрору выступленні супраць негатыўных тэндэнцый культурнага развіцця, звужэння сферы выкарыстання і функцый беларускай мовы, «арыштаў беларусаў» засталіся ізаляванымі [64, арк. 2; 65, арк. 160—161].

Такім чынам, з першай паловы 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай палітыкі ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, накіраваная на стварэнне беларускай сацыялістычнай нацыі, забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай сацыялістычнай культуры ў БССР. Яна стварала ў цэлым спрыяльныя ўмовы для ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Адначасова праводзілася саветызацыя і інтэграцыя нацыянальных меншасцяў у адзінае грамадства пры захаванні і падтрымцы іх нацыянальнай ідэнтычнасці і асаблівасцяў. Згортванне беларусізацыі і работы сярод нацыянальных меншасцяў аказала негатыўнае ўздзеянне на развіццё беларускай савецкай дзяржаўнасці і ўтварыла рэальную небяспеку дэнацыяналізацыі і асіміляцыі насельніцтва БССР, фарміраванне этнічна аднароднага грамадства з разнастайных нацыянальных груп.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Сталін, І. В.* Марксізм і нацыянальнае пытанне / І. В. Сталін. — Менск : ДВБ, 1934. — 72 с.
2. *Ленин, В. И.* Вопросы национальной политики и пролетарского интернационализма / В. И. Ленин. — М. : Госполитиздат, 1959. — 191 с.
3. Беларусізацыя, 1920-я гады : дак. і матэрыялы / пад агул. рэд. Р. П. Платонава і У. І. Коршука. — Мінск : БДУ, 2001. — 270 с.
4. *Майзель, Л.* Десять лет борьбы и строительства / Л. Майзель, Ю. Шаповалов. — М. : Центриздат народов СССР ; Харьков ; Минск, 1930. — 45 с.
5. Матэрыялы да справаздачы Ўраду X Зьезду Саветаў БССР. — Менск : Кіраўніцтва спраў СНК і экан. нарады БССР, 1931. — 249 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4720.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 701. Воп. 1. Спр. 103.
8. *Гаруновіч, А.* Супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў розных колераў / А. Гаруновіч. — Менск : Белдзяржвыд, 1930. — 101 с.
9. *Чарнушэвіч, А.* Беларускі контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм / А. Чарнушэвіч. — Менск : БДВ, 1931. — 47 с.
10. Рэзалюцыі Кастрычніцкага Пленуму ЦК КП(б)Б. — Менск : Белдзяржвыд, 1930. — 33 с.

11. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений : в 55 т. / В. И. Ленин. — М. : Политиздат, 1965—1975. — Т. 24. Сентябрь 1913 — март 1914 г. — 1973. — 568 с.
12. *Таболаў, К.* Нацыянальнае пытаньне на XVI Зьезьдзе УсеКП(б)Б з дадаткам перад. арт. «Правды» / К. Таболаў. — Менск : БДВ, 1930. — 42 с.
13. Национальное образование в России: концепции, взгляды, мнения, 1905—1938 гг. : сб. док. : в 2 ч. — М. : ИНПО, 2002. — Ч. 2. — 312 с.
14. *Чарнецкі, Я.* Перабудаваць работу, забясьпечыць тэмпы / Я. Чарнецкі // Комуніст. выхаваньне. — 1930. — № 2. — С. 25—39.
15. *Сталин, И. В.* Марксизм и национально-колониальный вопрос / И. В. Сталин. — М. : Партиздат ЦК ВКП(б), 1937. — 232 с.
16. Трынаццаты зьезд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, 30 мая — 12 чэрв. 1930 г. Стэн. справ. — Менск : БДВ, 1931. — 830 с.
17. Пастанова Народнага камісарыяту Юстыцыі БССР. Натарыяльная інструкцыя // Бюлетэнь Народных Камісарыятаў і Цэнтральных установ Беларускай ССР. — 1932. — № 5. — С. 4.
18. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. — Ф. 126. Воп. 1. Спр. 8.
19. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 701. Воп. 1. Спр. 100.
20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 701. Воп. 1. Спр. 103.
21. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5606.
22. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 265. Воп. 1. Спр. 2944.
23. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці. — Ф. 5. Воп. 1а. Спр. 313.
24. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5013.
25. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 4757.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 15-п. Воп. 4. Спр. 560.
27. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6099.
28. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5475.
29. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10969.
30. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6343.
31. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7747.
32. *Тишков, В. А.* Этнополитология: политические функции этничности / В. А. Тишков, Ю. П. Шабаев. — М. : Изд-во Моск. ун-та, 2011. — 376 с.
33. *Сталин, И. В.* Марксизм и национально-колониальный вопрос / И. В. Сталин. — М. : Партиздат ЦК ВКП(б), 1937. — 232 с.
34. *Платонов, Р. П.* Перед крутым поворотом / под общ. ред. Р. П. Платонова. — Минск : БелНИИДАД, 2001. — 310 с.
35. ЦК РКП(б) — ВКП(б) и национальный вопрос : сборник : в 2 кн. — М., 2005. — Кн. 1. : 1933—1945. — 784 с.
36. *Сталін, І. В.* Нацыянальнае пытанне і ленінізм / І. В. Сталін. — Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1951. — 19 с.
37. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12832.
38. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 9116.
39. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 14721.
40. *Гікала, М. Ф.* Совецкая Беларусь / М. Ф. Гікала. — Менск : Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1937. — 51 с.
41. Больш увагі рускім пісьменнікам Беларусі // Літаратура і мастацтва. — 1939. — 30 студз. — С. 1.
42. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13225.
43. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12309.
44. Совецкая Беларусь / пад рэд. В. В. Бедзіна, І. Шапавалава, М. Т. Лынькова. — Менск : ДВБ, Аддзел паліт. літ., 1938. — 92 с.
45. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5068.
46. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6898.
47. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13233.
48. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13267.
49. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7184.
50. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 11021.
51. *Люторович, П. В.* Искусство советской Белоруссии / П. В. Люторович. — Минск : Госиздат БССР, ред. мас.-пол. лит., 1959. — 138 с.
52. *Платонаў, Р. П.* Лёсы / Р. П. Платонаў. — Мінск : БелНДІДАС, 1998. — 326 с.
53. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13225.
54. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13246.
55. *Калинин, М. И.* Об образовании Еврейской автономной области / М. И. Калинин. — М. : Эмес, 1934. — 23 с.
56. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12400.
57. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12451.
58. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13275.
59. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10870.
60. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 42. Воп. 1. Спр. 2131.
61. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10870.
62. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7125.
63. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13323.
64. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 11638.
65. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13224.

УДК 355.018

**В. М. Бабылёва, З. М. Казлова**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ПАМЯЦІ ПАКАЛЕННЯ XXI СТАГОДДЗЯ

Другая сусветная вайна, якая сышла ў гісторыю разам з XX ст., па сваіх маштабах, жорсткасці, людскіх і матэрыяльных стратах не мае сабе роўных. Яна прайшла праз лёсы $^4/_5$ насельніцтва зямнога шара. Ваенныя дзеянні вяліся на шырокіх кантынентальных і марскіх прасторах. У вайне загінулі каля 60 млн чалавек. Сярод іх, паводле апошніх дадзеных, — кожны трэці жыхар Беларусі, а гэта найбольшыя страты сярод народаў СССР [1, с. 239].

© Бабылёва В. М., Казлова З. М., 2018